ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 1 (240) | Субота, 8 студзеня 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ВІНШУЕМ!

Падведзены вынікі ІІ-га тура VI Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Пераможцамі конкурсу сталі 11 студэнтаў нашага ўніверсітэта. Яны ўдастоены дыпломаў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР першай ступені.

Віншуем лаўрэатаў Усесаюзнага конкурсу: студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта **Н. Сычова** (навуковы кіраўнік в. а. дацэнта **В. У. Матусевіч**), **Л. Толчыкаву** (навуковы кіраўнік дацэнт **У. С. Сідараў**), **А. Айзенштадта** (навуковы кіраўнік дацэнт **І. П. Панкоў**); студэнтаў эканамічнага факультэта **А. Савіцкага** (навуковы кіраўнік дацэнт **Я. А. Семянчук**), **В. Бобрыка** (навуковы кіраўнік прафесар **М. В. Навучыцель**), **Ю. Ільёва** (навуковы кіраўнік дацэнт **М. М. Маёраў**), **В. Забалоцкую** (навуковы кіраўнік в. а. дацэнта **Я. П. Кульбацкі**), **Г. Коўзік** (навуковы кіраўнік ст. выкладчык **У. С. Дайнека**), **Л. Качайла** (навуковы кіраўнік асістэнт **Н. В. Герасімчык**); студэнта фізічнага факультэта **А. Брындзікава** (навуковы кіраўнік дацэнт **Э. М. Энцін**); студэнтку біялагічнага факультэта **В. Дзенісенка.** Дыпломаў удастоены яе навуковыя работы па гісторыі КПСС (навуковы кіраўнік в. а. дацэнта **У. П. Ксянзоў**) і па філасофіі (навуковы кіраўнік **У. М. Калмыкоў**).

**М. САМУСЕНАК,**
**начальнік студэнцкага канструктарскага бюро.**

*Фотарэпартаж*

# СЕСІЯ ЭКЗАМЕНУЕ



У студэнтаў цяпер хвалюючая і гарачая пара: ідзе зімовая залікова-экзаменацыйная сесія. У нашым універсітэце яе здаюць больш чатырох тысяч юнакоў і дзяўчат. Асабліва хвалююцца першакурснікі. Для іх гэта — першае выпрабаванне на права называцца сапраўднымі студэнтамі вядучай вышэйшай навучальнай установы беларускага Палесся.

Напружанне сесіі цяпер адчуваецца ва ўсім: па цішыні, якая ўсталявалася ў вучэбных карпусах, па перапоўненасці чытальных залаў бібліятэкі, па нягаснучых агнях у інтэрнатах, па тым, як цягнуцца ў апошнія мінуты перад экзаменам да падручнікаў і канспектаў будучыя гісторыкі і філолагі, фізікі і матэматыкі, біёлагі і геолагі, эканамісты і работнікі фізічнай культуры.

У вучэбным корпусе № 1 заходзім у аўдыторыю 2—1. Першакурснікі гісторыка-філалагічнага факультэта — будучыя філолагі — здаюць тут экзамен па гісторыі КПСС. Экзаменатар — кандыдат гістарычных навук Віталь Уладзіміравіч Матусевіч. Глядзім у экзаменацыйную ведамасць. З дзесяці выстаўленых адзнак — тры «выдатна» і сем «добра».

Адказвае Ала Бондар. Пытанні білета — «Камуністычная партыя —арганізатар СССР. Пісьмо У. І. Леніна «Аб утварэнні СССР». Міжнароднае значэнне ўтварэння СССР» і «Барацьба КПСС за згуртаванне радоў сусветнага камуністычнага руху. Нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый 1957 і 1960 гадоў».

Кароткае хваляванне паступова знікае. Ала ўпэўнена адказвае на асноўныя і на дадатковыя пытанні. Экзаменатар з задавальненнем ставіць у закікоўку А. Бондар першую адзнаку — «выдатна» **(на здымку ўверсе злева)**



Дацэнт кафедры палітэканоміі У. Ф. Бондараў у гэты дзень прымаў экзамен на чацвёртым курсе аддзялення беларускай і рускай моў і літаратур гісторыка-філалагічнага факультэта па палітычнай эканоміі сацыялізму. Да нашага прыходу парадавалі выкладчыка добрымі і выдатнымі ведамі студэнты Я. Бабарыкіна, Г. Калачык, Л. Беланожка, Л. Цімашэнка.

Адказвае Яніна Бернюкевіч **(на здымку — уверсе справа)**. Пытанні яе білета— «Сутнасць сацыялістычнага расшыранага ўзнаўлення» і «Заканамернасці і эканамічныя перадумовы зніжэння цэн. Праблема ўдасканальвання цэн». Экзаменуемая дае на іх грунтоўныя адказы. Аднак для высокай адзнакі гэтага яшчэ недастаткова. У. Ф. Бондараў паступова задае пытанні: «Якія функцыі выконвае цана?», «Асноўныя напрамкі эканамічнай стратэгіі партыі». Тут жа задаюцца пытанні аб апошнім зніжэнні цэн на тавары шырокага асартыменту і іх павышэнне на некаторыя дэфіцытныя тавары. Экзаменатар дамагаецца глыбокага асэнсавання тэарэтычных ведаў і практыкі жыцця. Таму да кожнага адказу ён адносіцца з патрэбнай строгасцю. Веды Яніны Бернюкевіч ацэньваюцца на «добра».



У той жа дзень трэцякурснікі гістарычнага аддзялення здавалі экзамен па гісторыі СССР. Яго прымаў кандыдат гістарычных навук А. А. Рубан. Уважліва і прынцыпова ён адносіўся да кожнага экзаменуемага. І прыёмна было яму чуць грунтоўныя адказы студэнтаў, за якія былі пастаўлены ў асноўным добрыя і выдатныя адзнакі. А. А. Рубан застаўся задаволеным і адказам Н. Півун **(на здымку— сярэдні справа)**.

Сур'ёзна рыхтаваліся да першага экзамена трэцякурснікі эканамічнага факультэта. Будучыя спецыялісты па эканоміцы працы здавалі экзамен па бухгалтарскаму ўліку. Яго прымаў кандыдат эканамічных навук І. К. Кекіш. Толькі два студэнты з усёй групы атрымалі здавальняючыя адзнакі, астатнія — добрыя і выдатныя.



Ідуць экзамены. Гэтая сесія для студэнтаў — асаблівая. Кожны з іх гарыць жаданнем атрымаць права на падпісанне Рапарту Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Для гэтага трэба дабіцца на сесіі самай высокай паспяховасці.

**Б. ВАЛОДЗІН,**
Фота **А. Карніенкі.**

# ПА ВЫНІКАХ ПРАКТЫКІ

На эканамічным факультэце прайшлі канферэнцыі па выніках навукова-даследчай работы студэнтаў 5-га курса спецыяльнасці «Эканоміка працы». Заслухана і абмеркавана 9 дакладаў па праблемах выкарыстання рабочага часу рабочымі, ІТР і служачымі. Выступленні студэнтаў засноўваліся на матэрыялах, атрыманых імі самастойна пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў кафедры эканомікі працы ў час вытворчай практыкі.

Вялікую цікавасць ва ўсіх удзельнікаў канферэнцый выклікалі паведамленні студэнтаў Т. Чырык, М. Бордака, Л. Паўленка, Т. Стэфанавай, Т. Сідаравай і Н. Заіка. Ажыўленая дыскусія разгарнулася вакол выступлення Н. Заіка «Пытанні ўдасканальвання арганізацыі працы работнікаў службы аддзела працы і заработнай платы (на прыкладзе аб'яднання «Рэчыцадрэў»). Студэнтка гаварыла аб асноўных праблемах арганізацыі працы работнікаў, падрыхтоўка якіх ажыццяўляецца на эканамічным факультэце нашага ўніверсітэта.

Пяцікурснікі абмяняліся вопытам арганізацыі працы нарміроўшчыкаў на прадпрыемствах розных галін народнай гаспадаркі, азнаёміліся з перадавым вопытам Волжскага аўтазавода.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**старшы навуковы супрацоўнік НДС,**
**А. САСНОЎ,**
**аспірант.**

# ХРОНІКА

Загадам міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 5 студзеня 1977 года па асабістай просьбе вызвален ад абавязкаў прарэктара па вучэбнай рабоце кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Д. А. Лявончанка.**

За актыўную, плённую працу на пасадзе прарэктара Дзмітрый Андрэевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Д. А. Лявончанка абраны дацэнтам кафедры беларускай мовы і назначаны намеснікам дэкана гісторыка-філалагічнага факультэта.

Прарэктарам па вучэбнай рабоце назначаны доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры алгебры і геаметрыі **Шамяткоў** Леанід Аляксандравіч.

# ПРЫМАЮЦЦА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

У падраздзяленнях універсітэта гэтымі днямі праходзяць адкрытыя партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваюцца вынікі работы за першы год дзесятай пяцігодкі і прымаюцца сацыялістычныя абавязацельствы на 1977 год. Рыхтуючы дастойную сустрэчу 60-годдзю Вялікага Кастрычніка, калектывы ГДУ вызначаюць для сябе высокія рубяжы ва ўсіх сферах вучэбнай, навуковай, гаспадарчай і грамадскай дзейнасці.

На геалагічным факультэце з дакладам выступіў старшыня прафбюро Г. С. Чарнышоў. Ён гаварыў не толькі аб дасягнутых поспехах, але і аб тых недахопах, якія калектыву факультэта патрэбна неадкладна ўхіляць.

У рабоце партыйнага сходу геалагічнага факультэта прыняў удзел і выступіў рэктар універсітэта Б. В. Бокуць.

Высокія сацыялістычныя абавязацельствы прыняты ўчора калектывам гісторыка-філалагічнага факультэта. Яго камуністы абмеркавалі таксама стан палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Па гэтаму пытанню выступіў з дакладам сакратар камсамольскага бюро факультэта Міхаіл Абраменка.

Былі заслуханы справаздачы камуністаў: выкладчыцы кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі Н. Л. Трацдяковай, студэнтаў В. Цвірко і Т. Захарчанка аб выкананні імі статутных патрабаванняў члена КПСС.

# АДУКАЦЫЮ—БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

Пры чытанні лекцый і правядзенні лабараторна-практычных заняткаў выкладчыкі нашай кафедры асаблівую ўвагу студэнтаў звяртаюць на тыя пытанні праграмы, вывучэнне якіх дазваляе атрымаць тэарэтычныя веды і адначасова авалодаць медыка-педагагічнымі прыёмамі, навыкамі самастойнага даследавання, што дапаможа ў практычнай дзейнасці выкладчыку фізічнай культуры.

З мэтай паляпшэння самастойнай работы і падрыхтоўкі студэнтаў да лабараторна-практычных заняткаў, кафедра аформіла стэнд «Студэнту-завочніку». На ім прадстаўлена неабходная інфармацыя па спартыўнай медыцыне ўсіх курсаў.

На кафедры вялікая ўвага надаецца ўкараненню навуковых даследаванняў у вучэбны працэс (ВДРС) не толькі на дзённым, але і на завочным аддзяленні.

## ДЛЯ УДАСКАНАЛЬВАННЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

Па ўсіх асноўных курсах, якія чытаюцца на кафедры, распрацаваны індывідуальныя заданні (лячэбны кантроль і ЛФК, агульная гігіена, фізіялогія спорту). Распрацаваны і ўкаранёны ў вучэбны працэс спецкурс «Анатома-фізіялагічныя асаблівасці развіцця дзяцей і падлеткаў пры занятках фізічнымі практыкаваннямі» для студэнтаў 5-га курса. Па данаму спецкурсу выдадзен вучэбны дапаможнік, прызначаны, у асноўным, для студэнтаў-завочнікаў. Чытанне названага спецкурса ліквідавала недахоцы ў вучэбнай праграме па гэтаму раздзелу.

На працягу чатырох гадоў на завочным факультэце вядзецца вучэбна-даследчая работа студэнтаў па тэме «Фізічнае развіццё школьнікаў Палесся». У студзені кожнага года для студэнтаў-пяцікурснікаў на кафедры праводзіцца навуковая студэнцкая канферэнцыя па выніках ВДРС. На ёй заслухоўваюцца лепшыя даклады, некаторыя рэкамендуюцца на рэспубліканскі агляд-конкурс студэнцкіх работ.

Так, у 1975 годзе работа студэнта 5-га курса І. Фралова «Фізічнае развіццё юных барцоў Пінскай ДЮСШ» атрымала ІІ-ю катэгорыю. Работы студэнтаў В. Андрушчанкі і Л. Беражковай таксама атрымалі ІІ-ю катэгорыю на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе студэнцкіх работ.

У вучэбным працэсе кафедра выкарыстоўвае элементы безмашыннага праграмавання, выкладчыкамі наладжан дзелавы кантакт са студэнтамі факультэта.

**А. КАЛУГІН,**
**загадчык кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны, доктар медыцынскіх навук, прафесар.**

СЛОВА — ТЫМ, ХТО ВУЧЫЦЦА

# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

Аднойчы ў Эйнштэйна спыталі: «У чым сакрэт жыццёвага поспеху?» У адказ на дошцы была напісана формула. Першы яе знак азначаў уменне працаваць, другі—адпачываць, трэці — маўчаць.

Я з задавальненнем адзначыў пра сябе, што таксама прытрымліваюся такіх поглядаў. Умець працаваць патрэбна навучыцца. А дзе яшчэ больш можна атрымаць ведаў па арганізацыі працы, як не на аддзяленні «Эканоміка працы». І калі нас вучаць эфектыўнасці працы вялікіх калектываў, то рацыянальна арганізаваць сваю працу абавязаны перш за ўсё кожны эканаміст па працы (у тым ліку і будучы).

Больш прадуманая арганізацыя сваёй працы дазволіла мне, акрамя асноўнай дзейнасці, выконваць і грамадскія даручэнні: быць сакратаром камсамольскага бюро, старшынёй прафсаюзнага камітэта, намеснікам сакратара партыйнага бюро. Згадзіцеся, што пасля вырашэння працоўных спрэчак (ад адміністрацыі я ўдзельнічаю ў рабоце гэтай камісіі), або пасля бурнага пасяджэння пабудкома па размеркаванню жылплошчы не вельмі проста прыйсці дамоў і сесці за падручнікі. Зняць напружанне працоўнага дня мне дапамагаюць рэпетыцыі ў Брэсцкім народным тэатры, у якім вось ужо дзесяць гадоў я выступаю з вялікім задавальненнем. Цяжка з чым-небудзь параўнаць той эмацыянальны зарад, які атрымліваеш ад атмасферы спектакля, хвалявання глядзельнай залы, ад адносін з добрым дружным калектывам у час рэпетыцыі.

У вучобе дапамагае і маральная падтрымка калектыву. Калі я ад'язджаю на сесію, то ведаю, што за мяне хвалююцца не толькі мая сям'я, таварышы па працы, але і сябры па тэатру. А пасля экзаменаў мяне чакае сардэчная сустрэча з імі ў тэатры.

Сёлета — апошняя экзаменацыйная сесія і выступленне ў Мінску на заключным этапе І-га Усесаюзнага фестываля народнай творчасці. Давядзецца, мабыць, укараняць сістэму навуковай арганізацыі працы. І ўсё ж хвалююся, каб адказ на экзамене па арганізацыі і планаванню прамысловага прадпрыемства не пачаць словамі з паэмы «Васіль Цёркін»: «Лучше пять пройти атак, ждать шестую в сутки...».

Што датычыцца апошняга кампанента формулы Эйнштэйна, то з ім я яшчэ пакуль не разабраўся. Прымяненне прынцыпа «умець маўчаць» на пытанне «Колькі ў Гомелі спатрэбіцца нянек для дзіцячых садоў у 1980 годзе» на экзамене па планаванню народнай гаспадаркі не прынесла мне жадаемага поспеху.

Але прыйдзе час — вывучым і гэты прынцып. Наперадзе яшчэ шмат гадоў жыцця...

**Ф. САХАРЧУК,**
**студэнт-завочнік аддзялення эканомікі працы.**

*Лепшыя студэнты завочнага факультэта*



**На трэцім курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры вялікім аўтарытэтам карыстаецца Сяргей Аркадзьевіч Росікаў. Да кожнага экзамена ён рыхтуецца з вялікай стараннасцю. Прылежны студэнт гатоў заўсёды прыйсці на дапамогу таварышам.**

**С. А. Росікаў — выхавацель СПТВ-67. Атрыманыя ва ўніверсітэце веды дапамагаюць яму ў рабоце.**



**21 год працоўнага стажу за плячыма Раісы Данілаўны Агарэнка. Цяпер яна — старшы інжынер-эканаміст аднаго з прадпрыемстваў Гомеля. Раіса Данілаўна паспяхова сумяшчае работу з вучобай на аддзяленні эканомікі працы. Праз год яна стане дыпламаваным спецыялістам.**

**ФОТАЗДЫМКІ С. А. РОСІКАВА І Р. Д. АГАРЭНКА — НА ДОШЦЫ ГОНАРУ ЗАВОЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА УНІВЕРСІТЭТА.**

# НЕ ЗДРАДЗІЎШЫ АБРАНАЙ ДАРОЗЕ

Зімовая сесія... Для нас, шасцікурснікаў,—апошнія залікі і экзамены, да якіх мы так і не змаглі прывыкнуць. Цяпер не верыцца, што больш пяці гадоў мінула з таго моманту, калі мы ўбачылі свае прозвішчы ў спісе залічаных на завочны факультэт. Розныя абставіны перашкодзілі нам стаць стацыянарнікамі, і мы шчыра зайздросцім тым, хто з'яўляецца «сапраўдным студэнтам», бо ўжо неяк усталяваўся погляд на завочнікаў як на студэнтаў «ніжэйшай вартасці».

Але, паглядзеўшы цяпер на працэс навучання, яго вынікі, разумееш, што гэта не так. Магчыма, што сярэдні бал у нас крыху ніжэйшы. Бясспрэчна, не ўсе вытрымалі двайную ці трайную нагрузку (вучоба, работа, сям'я), але тыя, хто застаўся, ужо не здрадзяць абранай жыццёвай дарозе.

Багаты тэарэтычны матэрыял, атрыманы намі за час навучання ва ўніверсітэце, служыць добрай падтрымкай у нялёгкай справе выкладання роднай мовы і літаратуры, бо пераважная большасць з нас працуе ў школах і іншых установах асветы.

Апошняя сесія... Праз некаторы час — дзяржаўныя экзамены, абарона дыпломных работ. Потым, напэўна, будзе неяк не хапаць і начэй над кнігамі, і напружанасці сесіі, і хвалявання перад экзаменамі.

**Г. ШЫКІН,**
**студэнт-завочнік 6-га курса аддзялення беларускай і рускай моў і літаратур.**

# ПАТРАБУЕ ЖЫЦЦЁ

З кожным годам патрабаванні да настаўніка ўсё больш павышаюцца. Каб працаваць эфектыўна і якасна, неабходна перш за ўсё сістэматычна ўдасканальваць сваю прафесію.

Я паступіла ва ўніверсітэт пасля заканчэння факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Атрымалася так, што я пачала працаваць настаўніцай матэматыкі. Праз некаторы час зразумела — ведаў у мяне недастаткова. Вырашыла працягваць вучобу далей.

Зараз я працую намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ў сярэдняй школе. Спалучаць працу з вучобай нялёгка, а калі ў цябе яшчэ і сям'я — тым больш. Каб паспяхова займацца, неабходна сістэматычна працаваць над сабой, своечасова выконваць кантрольныя работы. Вялікую дапамогу аказваюць нам выкладчыкі. Шмат цёплых слоў хачу сказаць у адрас У. Ф. Філіпцова, М. В. Селькіна, Н. А. Ялецкага, І. Н. Каўтунова і інш. Яны заўсёды прыходзяць на дапамогу студэнтам-завочнікам, даюць каштоўныя парады, кансультацыі.

**А. АПОСТАЛАВА,**
**студэнтка-завочніца 4-га курса аддзялення матэматыкі.**

З ТВОРЧАСЦІ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ

# ОСЕННЕЕ

Я пишу эти строчки
В тихий час листопада,
Когда шепчутся листья,
О прошедшем скорбя,
И приходят стихи,
Как любовь, как награда.
Ты прочти их, мой друг,
Ведь они для тебя.
Кисть рябины пунцовой
Запах лета уносит,
Ярким пламенем гордо
Догорает она.
По-домашнему мирно
Бродит, ластится Осень,
А за нею украдкой,
Словно тень — тишина.
Слышишь, лист прошумел,—
Это музыки звуки,
В них и сладость, и боль,
И разлуки печаль.
Ветви, память храня,
Тянут тонкие руки,
А в ответ — крики птиц,
Улетающих вдаль.
Ты сейчас далеко —
За преградой преграда
Отделяет от нас
Дни несбывшихся встреч.
Мы молчаньем своим
Уверяем: так надо,
И не очень спешим
В сердце радость сберечь.
Дремлет клен над рекой,
Пряча зябко ладони
По притихшему парку
Я безмолвно иду.
Клен слезинку тайком
Мне на плечи уронит.
И опять как вчера
Стынут листья в пруду.
Возвращаюсь домой,
Утопая в сугробах,
Ослепительно жарких,
Золотых, огневых.
Если вдруг загрустишь,
То поверить попробуй
В чары солнечных брызг,
Что исходят от них.

**Н. АНДРЕЕВА.**
**студэнтка 6-га курса аддзялення рускай мовы і літаратуры.**

# ДАПАМАГАЮЦЬ ВЕДЫ

Шчасце настаўніка—у тым, што ён працягвае сябе ў сваіх вучнях. Каб вучням было што ўзяць ад настаўніка, яму неабходна пастаянна вучыцца і ўдасканальвацца.

З такой мэтай я паступіла ва ўніверсітэт і зараз займаюся на 4-м курсе завочнага факультэта аддзялення матэматыкі.

Я выкладаю матэматыку ў сярэдняй школе № 8 г. Гомеля. Веды, якія набываю ў ГДУ, вельмі дапамагаюць мне ў працы. Патрабуючы ад сваіх вучняў трывалых ведаў, трэба і самой быць для іх прыкладам ва ўсім. І я стараюся: паспяхова здаю залікі і экзамены, старанна выконваю ўсе кантрольныя работы.

Мае вучні заўсёды з нецярплівасцю чакаюць мяне з сесіі, заўсёды цікавяцца маімі поспехамі ў вучобе, і тады ўжо сорамна спасаваць перад сваімі выхаванцамі.

**Г. ЛУПЯК,**
**студэнтка 4-га курса завочнага факультэта аддзялення матэматыкі.**

# Літаратурны каляндар

# СЦЭНІЧНАЙ МОВАЮ АБ МУЖНАСЦІ НАРОДА

## *Беларускаму драматургу К. Л. Губарэвічу—70 гадоў*

5 студзеня беларускаму савецкаму драматургу Канстанціну Лявонцьевічу Губарэвічу споўнілася 70 год. З глухога закутка Магілёўшчыны — вёскі Радучы былога Чавускага павета — прыйшоў ён у літаратуру.

Пачаўшы з вершаў і апавяданняў, Кастусь Губарэвіч каля 30-ці год таму назад аддаў перавагу самаму складанаму з лірататурных жанраў — драматургіі.

П'есы К. Губарэвіча вызначаюцца надзённасцю, глыбокім сацыяльна-палітычным зместам, вастрынёй канфлікту, мастацкай дасканаласцю. Важнейшыя перыяды жыцця савецкай краіны, беларускага народа знайшлі сваё мастацкае адлюстраванне ў драматургіі пісьменніка.

Тэматыка творчасці Губарэвіча самая разнастайная. Яго цікавяць гістарычныя падзеі («Галоўная стаўка», 1957; «Брэсцкі мір», 1968), пытанні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва краіны («Простая дзяўчына», 1953; «На крутым павароце», 1956; «А куды ж нам падзецца?», 1963), гераізм савецкіх людзей у Вялікай Айчыннай вайне («Цэнтральны ход» з І. Дорскім, 1948; «Брэсцкая крэпасць», 1952, новая рэдакцыя — «Людзі і каменні», 1969). Апошняя тэма стала стрыжнявой ва ўсёй творчасці драматурга.

Аб жыцці і барацьбе савецкіх людзей у тыле ворага расказала першая п'еса К. Губарэвіча «Цэнтральны ход» (разам з І. Дорскім). Яна належыць да ліку п'ес, у цэнтры якіх стаяць рэальныя гістарычныя падзеі. З насычанай вострадраматычнымі падзеямі біяграфіі легендарнага Канстанціна Заслонава драматург бярэ факты, звязаныя з дзейнасцю героя ў акупіраванай Оршы. Менавіта гэты перыяд жыцця Заслонава, калі ён пастаянна знаходзіцца паміж жыццем і смерцю, у найбольшай ступені дазваляе раскрыць валявыя якасці яго характару, пабудаваць дзейсны, напружаны сюжэт, дасціпны сцэнічны дыялог. У надзвычай жорсткіх і небяспечных умовах мэтанакіравана вядзе Заслонаў барацьбу па збіранню сіл патрыятычнага падполля, арганізацыі дыверсій на чыгунцы. Ён выступае ў п'есе чалавекам выключнай мужнасці, партыйнай загартаванасці і ўвасабляе самыя высакародныя рысы нацыянальнага характару беларуса-патрыёта сваёй Радзімы.

Жыццёвыя падзеі ляглі і ў аснову гераічнай драмы «Брэсцкая крэпасць» (новы варыянт яе — «Людзі і каменні», 1968). Гэта п'еса аб мужнасці савецкіх людзей, бяспрыкладным подзвігу салдат і афіцэраў цяпер сусветна вядомага гарнізона, які загінуў, але не адступіў ні на крок. Слава абаронцаў Брэсцкай цытадэлі ніколі не будзе забыта народам. Вось чаму звяртанне пісьменнікаў да падзей у гэтай крэпасці з'яўляецца не толькі закамерным, але і неабходным. Кастусь Губарэвіч быў першым, хто расказаў пра бессмяротны подзвіг гарнізона. Ён «адкрыў» гэтую тэму для іншых пісьменнікаў, стварыўшых іншыя творы пра цытадэль над Бугам (фільм «Бессмяротны гарнізон» па сцэнарыю К. Сіманава, п'еса «Крэпасць над Бугам» і кніга «Брэсцкая крэпасць» С. Смірнова). Цяжка назваць галоўнага героя п'есы К. Губарэвіча: усе яны прасякнуты адзіным жаданнем — даць знішчальны адпор ворагу. Такімі з'яўляюцца і палкавы камісар Зімін, і капітан Трубачоў, і радавыя байцы.

Найбольш удаецца драматургу вобраз простага чалавека—радавога байца. Поспех п'ес К. Губарэвіча шмат у чым і тлумачыцца майстэрствам раскрыцця народнага характару, удалым паказам нязмернай маральнай перавагі савецкіх воінаў, пра якіх нават ворагі ў роспачы гавораць: «Ну не каменне ж вы, а самыя звычайныя людзі». У вострым славесным паядынку, які разгортваецца пры допыце байца Кукушкіна, аўтару ўдаецца лаканічнымі і ў той жа час яркімі штрыхамі раскрыць багатую душу савецкага чалавека. Гэты эпізод можа служыць узорам сцэнічнага дыялога, дзе кожная рэпліка насычана глыбокім зместам. П'еса мае яскрава выражаны жыццесцвярджальны аптымістычны характар. Атымізм гэтай трагедыі ў тым, што яе героі глыбока разумеюць значэнне свайго подзвігу ў агульнай барацьбе, «паслабляюць удары ворага па нашаму фронту».

У гісторыка-рэвалюцыйнай драме «Брэсцкі мір» К. Губарэвіч паказвае надзвычай складаную абстаноўку, у якой Уладзімір Ільіч Ленін вядзе цяжкую напружаную барацьбу за падпісанне міру з Германіяй.

Падзеі ваеннага часу выклікалі павышаную цікавасць пісьменніка да гераічнага мінулага краіны. «Яшчэ з юнацкіх год я ведаў, што рабілася ў маім родным Магілёве напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі, якую пагрозу таіла ў сабе духонінская Стаўка для рэвалюцыйнага Петраграда».

Перагортваючы старонкі гісторыі, драматург знайшоў яркі прыклад гераізму і самаадданасці простага чалавека, наспявання ў народных масах пратэсту супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання, што пераканаўча паказана ў п'есе «Галоўная стаўка». Выразнікам і носьбітам інтарэсаў народа тут з'яўляецца салдат Сымон Кныш. Праз небяспечныя сітуацыі праводзіць аўтар Сымона, паказваючы складаны шлях яго ў рэвалюцыю. Спачатку герой верыць у цара-заступніка, нават «скаргу яму салдацкую прывозіў», за што цар загадаў расстраляць свайго вернага салдата перад ротай. Сымон заключае, што «і цар немцу прадаўся», і прыходзіць да рэвалюцыйнага змагання. Удала знойдзена аўтарам поўная глыбокага сэнсу дэталь у фінале драмы. У царскім крэсле зручна ўладкаваўся салдат Сымон Кныш. Назіраючы гэтую сцэну, адзін з герояў драмы зазначае: «Раней тут сядзеў цар Мікалай Другі, а зараз задае храпавіцкага салдат Сымон, Сымон Першы... А ён зараз самы, што ні ёсць, першы чалавек на зямлі... На яго сёння — галоўная стаўка рэвалюцыі».

У сваёй аўтабіяграфіі яшчэ ў 1962 годзе драматург са смуткам зазначае: «...Я не напісаў яшчэ п'есу, якая задаволіла б мяне». Магчыма, гэта і так, але галоўнае — у іншым: героі твораў Заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Канстанціна Лявонцьевіча Губарэвіча пастаянна «жывуць» на сцэнах тэатраў, змагаюцца з ворагам, верна служаць свайму народу.

**Л. КАРАБАНАВА,**
**выкладчыца кафедры беларускай літаратуры.**

### ДЛЯ ПРАФЕСІЙНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ

# У ГУРТКУ «ЮНЫ ФІЗІЁЛАГ»

На кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлы для вучняў сярэдніх школ горада ўжо шосты год працуе гурток «Юны фізіёлаг». Мэта нашай работы — пазнаёміць вучняў, якія цікавяцца біялогіяй, з найбольш важнымі і значнымі праблемамі фізіялогіі, садзейнічаць санітарнай асвеце і самакантролю, прафарыентацыі на медыцынскія, біялагічныя, педагагічныя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці.

У час заняткаў у гуртку яго ўдзельнікі знаёмяцца з праблемамі цэласнага арганізма, узроўнем яго арганізацыі, самарэгуляцыяй біялагічных функцый, а таксама з практычным ужываннем дасягненняў фізіялогіі ў медыцыне і іншых біялагічных навуках.

У чытанні лекцый і правядзенні лабараторных заняткаў актыўны ўдзел прымаюць усе выкладчыкі кафедры. Пад іх кіраўніцтвам вучні набываюць навыкі карыстання лабараторным абсталяваннем, вучацца весці назіранні, важныя для фізіялагічнага самакантролю.

За мінулы год кафедрай фізіялогіі чалавека і жывёлы многа зроблена па ўдасканальванню методыкі правядзення заняткаў з вучнямі школ і прыцягненню да сістэматычных заняткаў у гуртку.



У бягучым навучальным годзе адбыліся значныя змены ў праграме заняткаў гуртка ў сувязі з выхадам новага падручніка па біялогіі. Дзейнасць гуртка будуецца на аснове «Праграмы факультатыўных заняткаў па біялогіі (фізіялогія чалавека)», рэкамендаванай Міністэрствам асветы СССР у 1976 годзе. Да работы ў гуртку сталі прыцягвацца таксама студэнты, якія спецыялізуюцца на кафедры. Будучыя педагогі, упершыню сустракаючыся з вучнямі, пераконваюцца ў правільнасці выбару сваёй спецыяльнасці. Гэтая форма вучэбна-даследчай работы студэнтаў значна дапамагае ім у набыцці педагагічнагаа вопыту.

**А. ПАЎЛЕНКА,**
**навуковы кіраўнік гуртка, асістэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлы.**

**На здымку:** удзельнікі гуртка «Юны фізіёлаг» у адной з лабараторый біялагічнага факультэта.

Фота **У. Маглышава.**

# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

### ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫЯ ПАРАДЫ СТУДЭНТАМ

**Будзь стрыманым.** Атрымаўшы «здавальняюча», не кідайся на шыю экзаменатара. Падумай, што б ты рабіў, калі б атрымаў «добра».

**Будзь тактоўным.** Як толькі экзаменатар сам пачынае адказваць на пытанні твайго білета, не перапыняй яго словамі: «Я сам так і думаў!».

**Будзь самакрытычным.** Не запэўнівай педагога: «На лекцыях нам гэтага не гаварылі», а сціпла адзнач: «У маім канспекце гэтага няма».

**Будзь ветлівым.** Пераканай выкладчыка ў тым, што не сказаў галоўнага толькі таму, што цаніў яго час. Не засмучай выкладчыка адмоваю прыйсці яшчэ раз. Але сам на гэта не напрошвайся.

**Заўвага:** Прапануючы ўсе гэтыя парады, хочам нагадаць, што не пашкодзіць яшчэ, між іншым, добра падрыхтавацца да здачы экзаменаў.

### ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО

...Студэнты-выдатнікі нашага ўніверсітэта самыя круглыя?

...калі расцягнуць шпаргалкі-гармонікі студэнта факультэта фізічнага выхавання М. П. пасля сесіі, то імі можна тройчы перапеработаць зямны шар і двойчы здаць экзамены.

...група энтузіястаў працуе над стварэннем мазаічнага пано «Зноў двойка». Патрабуюцца натуршчыкі.

### СТУДЭНТЫ ЎСМІХАЮЦЦА

Студэнт механіка-матэматычнага факультэта В. К., ідучы на экзамен, перабег дарогу чорнаму кату. Праз дзве гадзіны бедная жывёліна трапіла пад тралейбус. Характэрна тое, што В. К. атрымаў «выдатна».

•

— Скажы, як геолаг, калі твае пошукі былі самымі безнадзейнымі?

— Калі я шукаў у ведамасці студэнцкіх стыпендый сваё прозвішча.

### СЕСІЯ ГЭТА...

Што пасееш, тое і пажнеш.
«Лёс чалавека».
Гэта, калі цябе не разумеюць...
Тысяча старонак і адна ноч.

•

— Прафесар, я прашу «здавальняюча» не для сябе: мяне хвалюе агульны працэнт паспяховасці ўсёй групы ў цэлым.

•

Прафесар пытае ў студэнта:

— Што такое нерэнтабельнае ўкладанне?

— Запрасіць у рэстаран сваю цётку.

# Спорт

## СЕЗОН АДКРЫЛІ ЛЫЖНІКІ

Як толькі выпаў снег, лыжнікі нашага ўніверсітэта адкрылі зімовы спартыўны сезон. Яны правялі масавыя спаборніцтвы, прысвечаныя 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. На лыжню, пракладзеную ў маляўнічай мясціне каля в. Валатава, выйшла 17 мужчынскіх і 12 жаночых каманд, прадстаўляючых усе факультэты. За перамогу змагалася больш ста чалавек.

На дзесяцікіламетровай дыстанцыі сярод мужчын лепшы вынік паказаў адзін з мацнейшых маладых лыжнікаў рэспублікі чацвёртакурснік факультэта фізічнага выхавання М. Станскі. Другое месца — у студэнта эканамічнага факультэта М. Запольскага, трэцяе — у першакурсніка факультэта фізвыхавання І. Байкова.

Дзяўчаты спаборнічалі па 5-кіламетровай дыстанцыі і для пачатку сезону таксама паказалі добрыя вынікі.

Праведзеныя лыжныя гонкі дазволілі праверыць гатоўнасць нашых спартсменаў да ўдзелу ў спаборніцтвах больш буйнага маштабу.

**Ф. СЫРАДОЕЎ,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**

## У ДЗЕСЯТЦЫ МАЦНЕЙШЫХ

Па традыцыі напярэдадні новага года рэдакцыя абласной газеты «Гомельская праўда» распаўсюдзіла анкету з мэтай вызначыць 10 лепшых спартсменаў алімпійскага 1976 года. Па колькасці набраных балаў на першае месца выйшаў былы выхаванец нашага ўніверсітэта, майстар спорту міжнароднага класа, бронзавы прызёр XXI Алімпійскіх гульняў у Манрэалі ў бегу на 400 метраў з перашкодамі Яўген Гаўрыленка.

Другое месца ў дзесятцы мацнейшых адведзена таксама былой студэнтцы нашага ўніверсітэта, выпускніцы эканамічнага факультэта, майстру спорту міжнароднага класа, сярэбранаму прызёру чэмпіянату краіны па скачках у вышыню Надзеждзе Марыненка.

Трэцім у спісе лепшых спартсменаў года значыцца заслужаны майстар спорту СССР, мінулагодні чэмпіён краіны па веславанню на байдарках і каноэ, двойчы прызёр кубка краіны, пераможца міжнародных рэгат Віктар Вараб'ёў — студэнт факультэта фізвыхавання нашага факультэта.

Сярод называемых у анкетах, але па колькасці набраных ачкоў не папаўшых у дзесятку мацнейшых, значыцца студэнтка факультэта фізвыхавання Таццяна Саломкіна — пераможца маладзёжнага першынства краіны па акадэмічнаму веславанню.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Дэканат, выкладчыкі і студэнты завочнага факультэта аддзялення фізічнага выхавання глыбока смуткуюць з выпадку трагічнай гібелі студэнта III курса Вячаслава ПАТАП'ЕВА і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.**

АЗ 00012.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Наш адрас: вул. Савецкая, 104, галоўны корпус ГДУ, П. 5-3, Т. 6-27-71. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз.

Заказ 77